**Гушчынскі Ігар Генадзьевіч**

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка (Мінск, Беларусь)*

# ДЭМАКРАТЫЗАЦЫІ СУДОВАЙ СІСТЭМЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ ПАСЛЯ ЛЮТАЎСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ (САКАВІК – КАСТРЫЧНІК 1917 Г.)

Вынікам Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. стала звяржэнне ў Расійскай імперыі самадзяржаўя. Да склікання Устаноўчага сходу, які павінен быў вырашыць далейшы лёс краіны, функцыі дзяржаўнай улады былі ўскладзены на Часовы ўрад. У якасці асновы сваёй дзейнасці ён дэклараваў ідэю пабудовы дэмакратычнай прававой дзяржавы [1]. Відавочна, дасягненню дадзенай мэты павінна была адпавядаць сістэма правасуддзя. Галоўнай тэндэнцыяй у гэтай сферы ў сакавіку – кастрычніку 1917 г. сталі працэсы дэмакратызацыі.

Трэба адзначыць, што ў параўнанні з большасцю іншых сфер дзяржаўна-прававога ладу правасуддзе ў гэты час у меншай ступені падверглася зменам. Судовая рэформа 1864 г. у свой час апярэдзіла агульны ход працэсу палітычнай мадэрнізацыі Расійскай імперыі. Таму Часовы ўрад у якасці асновы сваёй палітыкі ў сферы суда абвясціў не пабудову новай судовай сістэмы замест старой, а вяртанне да першапачатковых прынцыпаў Судовых статутаў ад 20 лістапада 1864 г. – незалежнасці судовай улады, галоснасці, выбарнасці суддзяў і інш. Неўзабаве быў прыняты шэраг канкрэтных мер па скасаванні заканадаўчых навэл, прынятых у свой час самадзяржаўем для абмежавання гэтых прынцыпаў. Былі ліквідаваны спецыяльныя суды для разгляду палітычных спраў (Вярхоўны крымінальны суд, а таксама асобыя прысутнасці Сената, судовых палат і акруговых судоў з удзелам саслоўных прадстаўнікоў). Быў канчаткова скасаваны інстытут земскіх участковых начальнікаў, які па сваёй сутнасці супярэчыў прынцыпам усесаслоўнасці суда і незалежнасці правасуддзя ад адміністрацыйнай улады. Узнаўлялася дзеянне выбарных міравых судоў. Было дазволена займацца адвакацкай дзейнасцю жанчынам [2, с. 13, 21], [3, с. 224–238, 554]. Акрамя таго, некаторыя дзеянні Часовага ўрада па дэмакратызацыі правасуддзя выходзілі за рамкі проста вяртання да першапачатковага тэксту Судовых статутаў. Напрыклад, выбарнымі станавіліся пасады не толькі міравых суддзяў, але і членаў судовых палат і акруговых судоў (у тым ліку судовых следчых). Яны павінны былі выбірацца агульнымі сходамі адпаведных судовых устаноў і зацвярджацца міністрам юстыцыі [4, с. 128–129]. Адмянялася правіла абавязковага зацвярджэння вярхоўнай уладай судовых прыгавораў, якія прадугледжвалі пазбаўленне ўсіх правоў стану пэўных катэгорый грамадзян (дваран; чыноўнікаў; святароў; асоб, узнагароджаных ардэнамі і адзнакамі, пазбаўленне якіх было магчымым толькі з дазволу імператара) [2, с. 27–28]. Гэта адпавядала прынцыпу скасавання саслоўных прывілеяў. Важнае значэнне для фарміравання грамадзянскай супольнасці мела стварэнне паводле пастановы Часовага ўрада ад 30 мая 1917 г. інстытута адміністрацыйнай юстыцыі [3, с. 527–540].

Адным з першых захадаў Часовага ўрада па рэфармаванні судовай

сістэмы стала прыпыненне дзейнасці земскіх участковых начальнікаў [2, с. 13]. Іх судовыя функцыі ускладаліся на часовых суддзяў, якія прызначаліся губернскімі камісарамі па ўзгадненні з павятовымі камісарамі [5, арк. 4]. Часовыя суддзі ў адрозненні ад сваіх папярэднікаў не выконвалі функцый адміністрацыйнай улады. Яны павінны былі дзейнічаць да моманту пачатку дзеяння выбарных міравых суддзяў.

У розных губернях ідэя замены земскіх участковых начальнікаў часовымі суддзямі была рэалізавана з рознай ступенню паспяховасці. У Мінскай губерні часовыя суддзі былі прызначаны і прыступілі да выканання сваіх абавязкаў у красавіку 1917 г. [5, арк. 23–26]. Прычым яны тут дзейнічалі аж да канца 1917 г., пакуль не былі скасаваны бальшавікамі. Справа ў тым, што да гэтага часу выбары міравых суддзяў у Мінскай губерні, за выключэннем Барысаўскага павета, так і не былі праведзеныя. У Віцебскай губерні спроба замяніць скасаваных земскіх начальнікаў часовымі суддзямі фактычна не ўдалася. Яны пэўны час функцыянавалі толькі ў Невельскім, Полацкім, Себежскім і, магчыма, Віцебскім паветах. А ў чэрвені – пачатку жніўня 1917 г. ва ўсіх паветах губерні, акрамя Себежскага, былі выбраныя і пачалі працу міравыя суддзі [6, арк. 38–46]. Што датычыць Магілёўскай губерні, то, на жаль, звестак аб прызначэнні і дзейнасці тут часовых суддзяў выявіць не ўдалося.

Трэба адзначыць, што ў шэрагу выпадкаў месца практыка ўзгаднення павятовымі камісарамі кандыдатур часовых суддзяў з земскімі павятовымі сходамі або павятовымі выканаўчымі камітэтамі (органамі адміністрацыі, створанымі ў перыяд рэвалюцыі), ці ўвогуле іх выбару гэтымі органамі. А ўжо затым адпаведныя спісы перадаваліся губернскаму камісару для зацвярджэння [5, арк 9 – 9 адв.], [7, арк. 5]. Гэта адпавядала тэндэнцыям дэмакратызацыі грамадства і сферы правасуддзя ў прыватнасці.

Адметнай рысай дзейнасці часовых суддзяў, прынамсі ў Мінскай губерні, была магчымасць удзелу ў разборы спраў прадстаўнікоў ад насельніцтва. Гэта павінна было спрыяць фарміраванню ў людзей пачуцця даверу да правасуддзя. 8 красавіка 1917 г. Мінскі губернскі камітэт пры Мінскім губернскім камісары сваім рашэннем надзяліў валасныя камітэты правам выбіраць «присяжных» для ўдзелу ў працы часовых суддзяў [5, арк. 30]. Неўзабаве дадзеная ідэя знайшла адлюстраванне ў пастанове Часовага ўрада ад 4 мая 1917 г., яка прадугледжвала увядзенне выбарных міравых судоў. Паводле яе разам з міравымі суддзямі ўдзел у вырашэнні спраў прымалі прадстаўнікі ад насельніцтва – так званыя члены міравога суда. Яны павінны былі выбірацца валаснымі земскімі сходамі і гарадскімі думамі. Нягледзячы на тое, што ў Мінскай губерні правядзенне выбараў міравых суддзяў затрымлівалася, мясцовы губернскі камісар 8 ліпеня 1917 г. прадпісаў валасным камітэтам (бо валасных земстваў тут яшчэ таксама не было) выбраць па 2 члены міравога суда. Да выбрання міравых суддзяў яны павінны былі дзейнічаць пры часовых суддзях [5, арк. 38]. У якой ступені гэта было рэалізавана, на падставе наяўных дакументаў сказаць цяжка. Але прынамсі пры некаторых часовых суддзях Слуцкага, Мінскага і Наваградскага паветаў члены суда ад насельніцтва дзейнічалі [8, арк. 30; 5, арк. 42; 9, арк. 35–36].

Што датычыць гарадоў і мястэчак, то да сакавіка 1917 г. судовыя функцыі, адпаведныя юрысдыкцыі земскіх начальнікаў у сельскай

мясцовасці, тут выконвалі гарадскія суддзі. Звестак аб іх скасаванні ў дадзены перыяд няма. Віцебскі губернскі камісар А. Валковіч адзначаў імкненне гарадскога насельніцтва да дэмакратызацыі ўсіх сфер грамадскага жыцця і недавер да ўсяго, што мела карані ў старым ладзе. Мяркуючы па ўсім, падобны настрой меў месца і ў адносінах да гарадскіх суддзяў. Аб гэтым сведчыць просьба А. Валковіча ад 12 красавіка 1917 г. да міністра юстыцыі тэрмінова ўвесці ў губерні часовыя суды па прыкладу петраградскіх [6, арк. 9]. Г. зн. суды ў складзе міравога ці гарадскога суддзі і двух засядацеляў (ад рабочых і салдат) [2, с. 364, 367, 378, 385, 386, 403]. Мяркуючы па наяўных архіўных дакументах, згоды на гэта атрымаць не ўдалося. Тым не менш у Дзвінску часовыя суды па ўзору петраградскіх былі створаны і дзейнічалі. У Віцебску жа ўвогуле былі выпадкі вырашэння грамадзянскіх спрэчак Саветам салдацкіх дэпутатаў [7, арк. 5].

4 мая 1917 г. Часовым урадам была выдадзена пастанова аб часовым уладкаванні мясцовага суда [2, с. 224–238]. Паводле яе на неакупіраванай частцы тэрыторыі Беларусі павінны былі быць уведзены выбарныя міравыя суды. Пры гэтым у адрозненні ад Судовых статутаў 1864 г. для міравых суддзяў цяпер не прадугледжваўся маёмасны цэнз. Акрамя таго, як ужо было згадана вышэй, міравыя суды станавіліся не аднаасобнымі, а калегіяльнымі судовымі органамі (з удзелам двух членаў міравога суда).

Працэс укаранення інстытута міравых суддзяў у розных губернях адбываўся па рознаму. У Мінскай губерні ў 1917 г. міравыя суддзі былі выбраныя і дзейнічалі толькі ў Барысаўскім павеце [10, арк. 22]. У астатніх жа паветах працягвалі функцыянаваць часовыя суддзі. У Віцебскай губерні ва ўсіх паветах, акрамя Себежскага, летам 1917 г. міравыя суддзі былі выбраныя і прыступілі да працы [6, арк. 38–46]. У Магілёўскай губерні міравыя суддзі, таксама былі выбраныя і прыступілі да працы, прынамсі ў верасні 1917 г. [11].

Часовым урадам на судовую сістэму былі ўскладзены дадатковыя функцыі, якія значна павышалі яе ролю ў фарміраванні грамадзянскай супольнасці. Па-першае, гэта выявілася ў стварэнні інстытута адміністрацыйнай юстыцыі – спецыяльнай сістэмы судовых устаноў для рэгулявання ўзаемаадносін грамадства і мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання. Па-другое, у кампетэнцыю акруговых судоў былі перададзены функцыі рэгістрацыі і вядзення рэестра кааператыўных і грамадзянскіх арганізацый.

Паводле пастановы ад 30 мая 1917 г. уводзіўся інстытут адміністрацыйнай юстыцыі [3, с. 527–540] – спецыяльная сістэма судовых устаноў для разгляду скарг на дзеянні мясцовых улад (камісараў, земстваў, гарадскіх дум і г.д.). Напрыклад, губернскі камісар мог абскардзіць рашэнне павятовага земскага схода, ці наадварот – земства пастанову камісара, альбо асобны грамадзянін меў права апратэставаць тое ці іншае дзеянне органа улады, і г. д. Адзначым, значную частку спраў складалі пратэсты і скаргі, якія датычылі рознага роду выбараў, у тым ліку дзейнасці камісій па падрыхтоўцы выбараў ва Устаноўчы сход. Сістэма адміністрацыйнай юстыцыі складалася з аднаасобных адміністрацыйных суддзяў, якія дзейнічалі ў паветах (па сваіх правах, парадку прызначэння і звальнення яны адпавядалі членам акруговых судоў), адміністрацыйных аддзяленняў акруговых судоў, 1-га дэпартамента Сената.

Адміністрацыйныя суддзі ў паветах Мінскай і Віцебскай губерняў былі прызначаны прыказамі Міністра юстыцыі ў ліпені–верасні 1917 г. [12, 13], [14, с. 95–96, 103]. Нажаль, практычна не захавалася дакладных звестак аб іх дзейнасці, а ў большасці выпадкаў – нават аб тым, ці ўвогуле яны прыступілі да працы. Вядома, што восенню 1917 г. адміністрацыйныя суддзі дакладна функцыянавалі ў Мінскім [15, арк. 34], Барысаўскім [16, арк. 1], Мазырскім [17 арк. 1] і Віцебскім паветах [15, арк. 69]. Згодна з пастановай Часовага ўрада ад 15 чэрвеня 1917 г., да ўвядзення адміністрацыйных суддзяў іх абавязкі ўскладаліся на мясцовых міравых суддзяў [3, с. 541]. А там, дзе яны яшчэ не былі выбраныя, дадзеныя функцыі перадаваліся часовым суддзям [18, арк. 90]. Улічваючы, што ў гэты час ішла падрыхтоўка да ўвядзення валасных земстваў, то дзейнасць многіх часовых і міравых суддзяў набывала дадатковае значэнне, бо менавіта ім станавіліся падсуднымі скаргі па выбарах у гэтыя органы.

Звестак аб дзейнасці адміністрацыйных аддзяленняў акруговых судоў на тэрыторыі Беларусі таксама няшмат. Вядома, што ў Мінску яно было адкрыта 1 ліпеня 1917 г. (сам жа Мінскі акруговы суд працягваў заставацца ў Маскве, куды быў эвакуіраваны восенню 1915 г.). Адміністрацыйнае аддзяленне акруговага суда ў Мінску працягвала працаваць да 17 снежня 1917 г., калі яго памяшканне было занята бальшавікамі [15, арк. 11–11 адв.]. У канцы ліпеня – пачатку жніўня 1917 г. прыказамі міністра юстыцыі быў сфарміраваны склад суддзяў адміністрацыйных аддзяленняў Віцебскага і Магілёўскага акруговых судоў [14, с. 95–96, 109]. На жаль, звестак аб тым, ці пачалі функцыянаваць яны на практыцы, выявіць не ўдалося.

Лютаўская рэвалюцыя стала каталізатарам значнай актывізацыі грамадска-палітычнага жыцця ў краіне. Адной з праяў гэтага стала масавае ўзнікненне рознага роду кааператыўных і грамадскіх арганізацый. Функцыя іх рэгістрацыі паводле пастановы Часовага ўрада «О регистрации товариществ, обществ и союзов» ад 21 чэрвеня 1917 г. ускладалася на акруговыя суды, пры якіх для гэтага ствараліся спецыяльныя рэгістрацыйныя аддзелы [3, с. 541–549]. Яны павінны былі ў месячны тэрмін пасля падачы заявы аб рэгістрацыі таварыства ці саюза прыняць рашэнне аб яго ўнясенні ў адпаведны рэестр альбо адмове ў гэтым. У апошнім выпадку судовая пастанова павінна была ўтрымліваць падрабязную матывіроўку са спасылкамі на артыкулы законаў, якім не адпавядаў статут арганізацыі, а таксама ўказаннем, у чым менавіта заключаюцца неадпаведнасці. Прычым асобна агаворвалася, што ўсё справаводства па рэгістрацыі павінна быць адкрытым і даступным для азнаямлення ўсіх жадаючых. У Мінску, Віцебску і Магілёве рэгістрацыйныя аддзяленні былі створаны і дзейнічалі.

Такім чынам, мы бачым, што адной з галоўных тэндэнцый у сферы суда у сакавіку–кастрычніку 1917 г. была яе дэмакратызацыя. Часовым урадам былі ліквідаваны элементы саслоўнасці, пашырана практыка выбарнасці суддзяў і замацаваны прынцып іх нязменнасці. Гэта значна памяншала ступень залежнасці суда ад адміністрацыйнай улады, а значыць адпавядала задачам пабудовы дэмакратычнай прававой дзяржавы. Аднак ажыццяўленне на практыцы дадзеных мерапрыемстваў ва ўмовах ваеннага часу, палітычнай нестабільнасці, недахопу фінансавання і кадраў і г. д. да кастрычніка 1917 г. не было рэалізавана ў поўнай ступені. А затым усталяванне бальшавікамі аднапартыйнай палітычнай сістэмы ўвогуле перарвала працэс

дэмакратызацыі правасуддзя і ў цэлым яго развіцця як інстытуцыянальнай асновы пабудовы дэмакратычнай прававой дзяржавы на тэрыторыі Расійскай імперыі.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. От Временного правительства // Вестник Временного правительства. – 1917. – 7 (20) март. – С. 1.
2. Сборник указов и постановлений Временного правительства. Выпуск № 1. 27 февраля – 5 мая 1917 г. / сост. Отд-нием Свода Законов Гос. Канцелярии. – Петроград : Гос. канцелярия, 1917. – VI, 2, 555 с.
3. Сборник указов и постановлений Временного правительства. Выпуск № 2. 5 мая – 24 июля 1917 г. : в 2 ч. / сост. Упр-нием Кодификацион. частью. – Петроград : Гос. канцелярия, 1918. – Ч. 1. – Отд. I–VIII – VII, 799 с.
4. Циркулярные распоряжения по Министерству юстиции // Журн. М-ва юстиции. – 1917. – № 7–8. – С. 124–135.
5. Нацыянальны гістарычы архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1684. Воп. 1. Спр. 8.
6. НГАБ. – Ф. 3445. Воп. 1. Спр. 37.
7. НГАБ. – Ф. 3445. Воп. 1. Спр. 63.
8. НГАБ. – Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 11.
9. НГАБ. – Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 7.
10. НГАБ. – Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 3.
11. Могилёвские губернские ведомости. – 1917. – С. №№ 37–49.
12. Приказы по ведомству Министерства юстиции // Вестник Временного правительства. – 1917. – 11 авг. – С. 4.
13. Приказы по ведомству Министерства юстиции // Вестник Временного правительства. – 1917. – 16 (29 сент.). – С. 4.
14. Приказы по ведомству Министерства юстиции // Журн. М-ва юстиции. – 1917. – № 7–8. – С. 81–123.
15. НГАБ. – Ф. 183. Воп. 1. Спр. 522.
16. НГАБ. – Ф. 183. Воп. 1. Спр. 550.
17. НГАБ. – Ф. 183. Воп. 1. Спр. 558.
18. НГАБ. – Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 1.



**Довгялло Михаил Степанович**

*Белорусский государственоый университет (Минск, Беларусь)*


# БЕЛОРУССКО-СЕРБСКИЕ ОТНОШЕНИЯ НА СОВРЕМЕННОМ ЭТАПЕ: ДОСТИЖЕНИЯ И ПРОБЛЕМЫ

Дипломатические отношения между Республикой Беларусь и Союзной Республикой Югославия (СРЮ), правопреемство от которой в феврале 2003 г. перешло Сербии и Черногории (СиЧ), а с июня 2006 г. – Республике Сербия (РС), установлены 15 ноября 1994 г. Поэтому история взаимных контактов двух независимых стран начинается с 1994 г. В марте 1996 г. состоялся первый официальный визит Президента СРЮ З. Лилича в г. Минск, ставшим первой европейской столицей, которую посетило руководство СРЮ после частичной отмены международных санкций ООН. По итогам визита делегации было подписано 8 документов [20, с. 134], среди которых особую роль играет Договор о Дружбе и сотрудничестве между РБ СРЮ [21, с. 32, 37], создавший политические условия для межгосударственных отношений, дальнейшего развития дружбы, взаимного уважения во всех формах двустороннего сотрудничества. В 1996 г.